Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 2 sprava 96

# Не допустим диктатуры!

### Уважаемые избиратели!

Под видом референдума в нашей старане осуществляется антиконституционный переворот. Группа людей во главе с А.Лукашенко пошла на сознательное нарушение законов и Конституции. Незаконно снят с должности и выдворен из рабочего кабинета председатель Центризбиркома В.Гончар. Людей заставляют проголосовать до 24 ноября — чтобы сорвать выборы и создать условия для фальсификации результатов референдума.

### Не голосуйте до 24 ноября!

Ведь даже если вы проголосуете по-своему, есть опасность, что подменят урны, и ваши голоса пойдут в поддержку диктатуры.

С уважением *Валентин Голубев.*

vytoki.net

## Выбары 24 лістапада

Кандыдат у дэпутаты
Вярхоўнага Савета
Рэспублікі Беларусь



# Валянцін Голубеў

Вядомы беларускі
палітык
і грамадскі дзеяч

**Адзіны кандыдат, які вылучаны жыхарамі нашай выбарчай акругі**

Нарадзіўся ў 1955 г., беларус, жыве на Паўднёвым Захадзе (вул. Алібегава, 27) . Жанаты, мае 2 сыноў. Кандыдат гістарычных навук.

Працаваў сакратаром камісіі Вярхоўнага Савета па міжнародных справах і знешнеэканамічных сувязях. Зараз — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. На грамадскіх пачатках узначальвае навукова-аналітычны цэнтр "Беларуская перспектыва".

Modern History Archives

***Шаноўныя людзі!***

*24 лістапада — не толькі рэферэндум, але і выбары. Упэўнены, што некаторыя з вас пра гэта не ведаюць, бо ўлады інфармацыі не даюць — не зацікаўлены. Робіцца ўсё, каб давыбары сарваць — таму і арганізавана незаконнае папярэдняе галасаванне па рэферэндуму. Успомніце — такога ніколі не было!*

*Прэзідэнт і яго каманда баяцца народнага кантролю, баяцца праўды, таму і ідуць на ўтрыманне ўлады незаконнымі метадамі.*

*Прэзідэнт заяўляе, што народ — адзіная крыніца ўлады. Гэта сапраўды так! Але чаму гэты народ аб'яўляецца мудрым і справядлівым толькі тады, калі ён галасуе за Прэзідэнта і яго Канстытуцыю. І чаму ён абавязкова "зробіць памылку", калі будзе выбіраць свайго дэпутата?*

***Выбары павіны адбыцца!***

***Так мы зможам выказацца супраць усталявання дыктатуры! Давайце зробім крок наперад і разам пераможам!***

*Паважаныя выбаршчыкі! Я,* ***Валянцін Голубеў,*** *добра разумею цяперашнюю складаную сацыяльна-палітычную і эканамічную сітуацыю. Разумею і тое, што нам разам трэба шукаць з яе выхад. На кандыдатаў у дэпутаты цяпер аказваецца ўціск, ім пагражаюць і запалохваюць.* **Але я не здамся.**

*Дзякуючы вашай падтрымцы і вашаму вылучэнню я зноў буду ўдзельнічаць у выбарах. На мінулагодніх выбарах за мяне прагаласавала 9800 чалавек (57%), але ўлады зрабілі ўсё, каб аб'явіць, што выбары не адбыліся. Вы ведаеце маю праграму, і я не збіраюся ад яе адмаўляцца — як у акрузе, так і ў Вярхоўным Савеце.*

*Звяртаюся да ўсіх жыхароў Паўднёвага Захаду-2, 3, 4, асабліва да тых, хто ўжо галасаваў за мяне.* ***Прыходзьце менавіта 24 лістапада!*** *У нас ёсць адзіны шанц перамагчы ў першым туры, бо другі правесці не дадуць.*

*З павагай да вас*

***Валянцін Голубеў,***
*кандыдат у дэпутаты*
*Вярхоўнага Савета*
*Рэспублікі Беларусь*
*па 232 Любімаўскай акрузе*

vytoki.net